**ПРЭС-РЭЛІЗ**

## Прэзентацыя Белай кнігі Савета Еўропы па міжкультурнаму дыялогу




**БЕЛАРУСЬ І КУЛЬТУРНАЯ ПАМЯЦЬ ЕЎРОПЫ**

**28 чэрвеня 2013 г.**
**15.00 – 16.30**

**Мастацкая галерэя М. Савіцкага**
**(Мінск, пл. Свабоды, 15)**

*28 чэрвеня 2013 г. з 15.00 да 16.30 у Мастацкай галерэі М. Савіцкага (Мінск, пл. Свабоды, 15) адбудзецца прэзентацыя Белай кнігі Савета Еўропы па міжкультурнаму дыялогу*. Выданне Белай кнігі на беларускай мове азначае не толькі яе ратыфікацыю, а і прызнанне нашай краінай каштоўнасцей, якія ў Белай кнізе рэпрэзентуюцца і падтрымліваюцца Саветам Еўропы.

Белая кніга Савета Еўропы па міжкультурнаму дыялогу ўвасабляе адзін з мажлівых адказаў на выклікі часу і прапануе мадэль кіравання культурнай разнастайнасцю, накіраваную ў будучыню. Белая кніга заклікае развіваць інтэнсіўны міжкультурны дыялог унутры і паміж еўрапейскімі грамадствамі, а таксама паміж Еўропай і яе суседзямі. Яна адрасавана кіраўнікам і адміністратарам, выкладчыкам і СМІ, а таксама арганізацыям грамадзянскай супольнасці, у тым ліку імігранцкім і рэлігійным супольнасцям, маладзёжным арганізацыям.

Прэзентацыю ладзяць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Інстытут культуры Беларусі і Мастацкая галерэя М. Савіцкага.

У праграме мерапрыемства запланаваны выступленні Спецыяльнага саветніка Генеральнага Сакратара Савета Еўропы па дэмакратыі **сп. Ульрыха Буньеса**, Міністра культуры Рэспублікі Беларусь **сп. Барыса Святлова** і інш.

Да ўдзелу ў прэзентацыі запрошаны прадстаўнікі Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, Міністэрства замежных спраў, Савета Еўропы, Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, устаноў культуры і адукацыі, амбасадары еўрапейскіх краін.

Тэл. для кантактаў: 017-2675938